тины как правильности взгляда на некоторые умозрительные идеи, находится в состоянии кризиса.

Целью образования и воспитания становится не освоение знаний, опыта, умений и навыков, а достижение нового качества разума как индивидуального, так и общественного. Европейская гуманистическая традиция акцентирует внимание на личности, признает ценность индивида и времени его жизни. Теория и практика современной высшей школы обладают значительным арсеналом личностно-ориентированных и развивающих образовательных технологий, обогатились в последние годы идеями диалога и полилога, сотрудничества, уважения личности и развития её сущностных сил.

Но возникло резкое противоречие: с одной стороны, гуманитарные знания и образование признаются квинтэссенцией информационной цивилизации XXI века, а с другой – такие знания и образование сокращают, делают однобокими, разрушая целостность, комплексность образовательного влияния на человека. Значительное сокращение учебных часов гуманитарного блока дисциплин, переведение некоторых гуманитарных дисциплин в разряд факультативных, необоснованная тотальная замена экзаменов тестовым контролем в современном украинском вузе могут спровоцировать ситуацию, что достижение декларированного личностно ориентированного образования с его плюрализмом, альтернативностью, креативностью, диалогичностью станет утопической идеей.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Петрелла, Р. Пять «ловушек» на пути развития образования // Социология образования. – 2003- №5.

2. Ильинский, И.М. Образовательная революция // Высшее образование для XXI века. Заседание Русского интеллектуального клуба. – М.: МГУ.- 23 июня 2003.

УДК 378.6:63(476.6)

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ І АГРАРНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПРЫВАТНАСЦІ

**Таранда М.І.**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У апошнія гады актыўна абмяркоўваецца далучэнне адукацыі Рэспублікі Беларусь да балонскага працэсу. У сувязі з гэтым правозіцца шэраг навукова-метадычных канферэнцый, на якіх давялося прысутнічаць і аўтару гэтага матэрыялу. І да гэтага дня не маю пераканання, што трэба памяняць старую сістэму адукацыі і наблізіць яе да заходняга ўзору, тым больш ведаючы думку расійскіх вучоных, якія дастаткова крытычна ставяцца да таго, што адбываецца ў вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі ў сувязі з рэформай.

Каму патрэбна падрыхтоўка бакалаўраў, якія будуць працягваць адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах? Наўрад ці пасля вучобы яны

захочуць вярнуцца назад у Беларусь. Тыя, хто пажадаў працягнуць вучобу на Захадзе і так паступілі ва ўніверсітэты Польшчы, Германіі, Швейцарыі, аб чым ведаю праз сумоўе з імі ў інтэрнэце. Кожны з іх атрымае дастаткова высокі навуковы ўзровень і адпаведную яму навуковую ступень. Добра ведаю, што нашы былыя выпускнікі маюць дастатковую базавую падрыхтоўку і шмат працуюць у галіне навуковых даследаванняў там, актыўна выступаюць на навуковых канферэнцыях і сімпозіумах у розных краінах.

Нарэшце Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт захапіў даволі шырокую прафесійную нішу па падрыхтоўцы спецыялістаў для сельскай гаспадаркі рэспублікі. Мы рыхтуем аграномаў і зоаінжынераў, ахоўнікаў раслін і ветэрынарных урачоў, тэхнолагаў па захоўванню раслiннай і жывёльнай сыравіны, атрыманых з яе прадуктаў перааапрацоўкі, а таксама эканамістаў і бухгалтараў, якім выкладаюцца азы вытворчых працэсаў кампетэнтнымі спецыялістамі ў аграрнай галіне, чаго немагчыма зрабіць у класічных універсітэтах. Шкада, што не рыхтуем сваіх архітэктараў, якія займаліся б праектаваннем і будоўляй сучасных аграгарадкоў, а таксама сельскагаспадарчых аб’ектаў, добра ведаючы патрэбнасці і асаблівасці гэтай галіны.

Выклікае шкадаванне, што да гэтага часу мы не маем вельмі патрэбнага і актуальнага факультэту, які б рыхтаваў будучых спецыялістаў для галіны агра- і экатурызму, бо працаваць у такім накірунку павінны тыя, хто добра ведае вясковае жыццё, усе асаблівасці атрымання раслiннай і жывёльнай прадукцыі, традыцыйныя рамёствы, сакрэты беларускай нацыянальнай кухні. Спецыялісты тэхналагічнага факультэта маглі б выкладаць для будучых фермераў дадатковыя прадметы, звязаныя з народнымі рамёствамі, якія маглі б зацікавіць турыстаў з Захаду. Бо самае цікавае для іх было б навучыцца і зрабіць нешта сваімі рукамі пад умелым кіраўніцтвам гаспадара такой аграсядзібы. Нават атрыманню прадуктаў тыпу вяндлін варта было б навучыць такіх спецыялістаў. А далей некалькі развbooжанняў наконт таго, чаму ў недалёкім будучым такія спецыялісты нам спатрэбяцца.

Вандруючы па Беларусі, асабліва падчас прафарыентацыі школьнікаў, я заўважыў, што нашы вёскі адыходзяць ў небыццё і праз 10-15 гадоў аб большасці з іх застануцца толькі быліны ды ўспаміны. Закрываюцца дзіцячыя садкі, пераўтвараючыся ў дамы, дзе дажываюць сваё жыццё спрацаваныя і нямоглыя былыя калгаснікі. Такі ж самы працэс бачны і на прыкладзе вёсак майго роднага калгаса “Беларусь”, а зараз СВК “Жарабковічы” Ляхавіцкага раёна, якім я заўсёды ганарыўся, ды і працягваю гэта рабіць, добра ведаючы аб яго вытворчых паказчыках. Зараз, разглядваючы дэмаграфічныя змены такіх родных мне вёсак на працягу доўгага часу, я і прыйшоў да падобных высноў. З дзесятак гадоў таму назад знікла вёска Астрэйкі, у якой па дадзеных перапісу 1897 года пражывалі 339 чалавек. У 2006

годзе на месцы вёскі пасля зносу апошніх пабудоў была праведзена поўная рэкультывацыя зямель. У 1950-м годзе 40 гаспадарак з вёскі Пірштукі аб’ядналіся ў калгас “Савецкая Беларусь”, а на 1 студзеня 2009 года ў Пірштуках застаўся толькі адзін чалавек. Толькі за апошнія 8 гадоў насельніцтва Зарытава зменшылася на 68 чалавек, Гулічаў - на 40 (у апошніх не засталося ніводнага жыхара працаздольнага ўзросту). І толькі ў цэнтральнай сядзібе СВК - Жарабковічах, дзякуючы пастаяннай будоўлі жылля, якая пачалася з 1980-х гадоў, захоўваецца колькасць жыхароў на ўзроўні 1897 года і то, у большасці за кошт перасяленцаў з іншых месц. Перспектыва, на мой погляд, такая: праз адзін ці два дзесяткі гадоў захаваюцца і будуць развівацца толькі цэнтральныя вёскі калгасаў. Добра, калі на месцы знікаючых вёсак пачнуць развівацца фермерскія гаспадаркі, ці гаспадаркі агратурыстычнай накіраванасці (для такіх мясцін і спатрэбяцца адпаведныя спецыялісты з высокім узроўнем адукацыі), якія для пасялення турыстаў змогуць набыць пустуючыя сялянскія хаты, давесці іх да неабходнага ўзроўню сервісу і падтрымаць ад разбурэння. Гэта будуць адначасова і помнікі беларускім вёскам, якія на працягу стагоддзяў стваралі і падтрымлівалі нацыянальную культуру, традыцыі, мову, бо беларускі горад ніколі не быў беларускім. У ім заўсёды развіваліся яўрэйская, руская ды польская культуры. Магчыма, дзякуючы інтэлігенцыі, якая разумее ўсе памеры трагедыі беларускага горада ды і цэлага народа, з часам адбудзецца беларусізацыя нашых гарадоў.

І таму, адной з праблем у беларускай вышэйшай адукацыі з’яўляецца яе рускамоўнасць, якая не рыхтуе спецыялістаў для сваёй краіны, здольных захаваць сваю культуру. Эмігранты з Беларусі ў Амерыцы складаюць зараз 2 мільёны чалавек. Такая ж колькасць беларусаў жыве і ў Расіі, калі верыць усесаюзнаму перапісу 1979 года. Але шмат беларусаў там маюць толькі нашы прозвішчы, а пішуцца даўно ўжо расіянамі.

Атрыманая рэспублікай ў 1990-я гады незалежнасць дала магчымасць некаторы час для развіцця роднай мовы. Ва ўніверсітэтах краіны пачалі выдавацца падручнікі па-беларуску (і наш універсітэт не быў выключэннем), але на жаль такі прагрэсіўны працэс спыніўся ў асобных ВНУ. І гэта аказалася вялікай памылкай, якую давядзецца выпраўляць ужо наступным пакаленням беларусаў. Зрабіць гэта зараз было б значна прасцей, бо старэйшае пакаленне, якое мае высокі прафесійны ўзровень да таго ж яшчэ памятае тую мову, на якой гаварылі іх бацькі, а калі не пішуцца на мове падручнікі, то вядома ж, не развіваецца і тэрміналогія. Я думаю, што ў плане выкладання мовы, мы адстаём ад ГДУ імя Я.Купалы, дзе па-беларуску вядзецца выкладанне матэматыкі, фізікі, біялагічных прадметаў, ад ГДМУ. І гэта ў той час, калі мы рыхтуем спецыялістаў для вясковага асяроддзя, дзе ўжыванне мовы сялянамі традыцыйна больш пашыранае, чым у гарадах. Хацелася б спадзявацца, што гэтая праблема калі-небудзь



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

будзе асэнсавана на ўзроўні кіраўніцтва Беларусі, якое зможа прыняць адпаведныя захады для вырашэння і гэтага, не менш важнага, чым эканамічнае развіццё, накірунку дзяржаўнага будаўніцтва. Бо мова беларуская нічуць не горшая для навучання, чым мова любой з краін нашых суседак. Не здарма ж нашы іншаземныя абітурыенты пытаюцца часам, а чаму мы вывучаем для паступлення ў ГДАУ рускую мову, а не беларускую, якая з'яўляецца адной з дзяржаўных моў Беларусі.

Адно з закранутых вышэй пытанняў, звязаных з агра- і экатурызмам паспяхова вырашаецца. Не маючы нават адпаведнай спецыялізацыі (чуў, што ў недалёкім будучым яна з'явіцца), наш універсітэт актыўна падключыўся і працуе ў гэтым накірунку разам з польскімі ВНУ, пастаянна ўдзельнічае ў міжнародных экалагічных праектах, у рэгулярных семінарах па экалагічных пытаннях, як на тэрыторыі Польшчы, так і на базе ГДАУ.

УДК 378.147:330.1

## ЭКОНОМИЧЕСКАЯ НАУКА XXI ВЕКА: СОВРЕМЕННЫЕ ОРИЕНТИРЫ В ОБРАЗОВАНИИ

**Шахнович С.В., Шахнович Е.С.**
УО «Витебский государственный университет им. П.М. Машерова»
г. Витебск, Республика Беларусь

Особенность современного этапа развития общества, называемого информационным, имеет ряд особенностей. Одной из них является то, что мир вступил в эпоху всеобщей реструктуризации. Этот процесс уже дает о себе знать. Он охватывает все уровни. Так, на глобальном уровне идет осмысление причин распада традиционно устоявшихся структур, которые формировались ранее в русле системного подхода, который как метод широкого обзора каких-либо процессов превращался в метод искусственного расчленения, выделения и развития отдельных, обособленных блоков. Возникали целые школы, которые способствовали гипертрофированному развитию этих блоков.

Проблема состоит в том, что пагубность гипертрофированного использования системного подхода не была замечена вовремя в гуманитарных отраслях знания.

А ведь ситуация коренным образом стала изменяться. В мире стремительно нарастают интеграционные процессы. Современное общество претерпевает изменения во всех сферах жизнедеятельности. Существование национальных систем образования, сложившихся к середине XX века изолированно друг от друга, не в состоянии удовлетворить требования, которые в настоящее время к нему предъявляются. «Интеграция национальных систем образования в единое мировое образовательное пространство с соответствующей их унификацией и обновлением в связи с требованием времени стало реальной необходимостью» [1, с. 4].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ